Министерство образования Республики Беларусь

*Учреждение образования*
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»

Исторический факультет

Институт истории Национальной академии наук Беларуси

# 1917 ГОД В ИСТОРИЧЕСКИХ СУДЬБАХ НАРОДОВ БЕЛАРУСИ

*Материалы Международной научно-теоретической конференции*

*г. Минск, 22 декабря 2017 г.*

Минск
БГПУ
2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 94(476)
ББК 63.3(4Беи)
Т936

Печатается по решению Совета исторического факультета БГПУ

Р е д к о л л е г и я:
кандидат исторических наук, доцент *А. В. Касович (отв. ред.);*
кандидат исторических наук, доцент *С. П. Шупляк;*
кандидат исторических наук, доцент *А. А. Корзюк*

Р е ц е н з е н т ы:
доктор исторических наук, профессор *А. П. Житко;*
доктор исторических наук, профессор *А. М. Лютый*

**1917 год** в исторических судьбах народов Беларуси : материалы
Т936 Международной научно-теоретической конференции, г. Минск, 22 декабря 2017 г. / Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка ; редкол.: А. В. Касович (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГПУ, 2017. – 252 с.
ISBN 978-985-541-414-9.

В сборнике представлены материалы исследований ученых Беларуси, России, Казахстана, Туркменистана, студентов, магистрантов, учащихся учреждений общего среднего образования, посвященные 100-летию Октябрьской революции.

Адресуется преподавателям, магистрантам и студентам вузов.

**УДК 94(476)**
**ББК 63.3(4Беи)**

**ISBN 978-985-541-414-9**

© Оформление. БГПУ, 2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ГІСТОРЫІ ГАРАДОЎ І МЯСТЭЧАК НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД ЗАРАДЖЭННЯ ІНДУСТРЫЯЛЬНАГА ГРАМАДСТВА

***Лютая А. Э.,*** *кандыдат гістарычных навук, дацэнт, БДПУ, г. Мінск*

Гісторыя гарадоў на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. закранаялася ў працах даследчыкаў дасавецкага перыяду У. Б. Антановіча, І. Д. Бяляева, М. Баліньскага, М. Ф. Уладзімірскага-Буданава, А. С. Грушэўскага, Ф. У. Кліменкі, М. К. Лютаўскага, Я. Ф. Арлоўскага, А. П. Сапунова, У. К. Стукаліча, Ф. У. Тараноўскага і інш. Яны галоўную ўвагу ўдзялялі палітычнаму развіццю гарадоў і амаль не закраналі сацыяльныя пытанні ў сувязі з развіццём эканомікі гарадоў. Шмат увагі яны звярталі ў сваіх працах пытанням рэлігійнай барацьбы паміж праваслаўнай і каталіцкай канфесіямі, а пытанні развіцця эканомікі гарадоў і мястэчак тлумачылі вынікамі гэтай барацьбы [1].

Дваранскія і буржуазныя гісторыкі, разглядаючы пытанні грамадска-палітычнага жыцця гарадоў і мястэчак на тэрыторыі Беларусі, звярталі ўвагу толькі на найбольш характэрныя рысы грамадскага ладу. Так, М. Ф. Владзімірскі-Буданаў, У. Б. Антановіч закраналі, напрыклад, пытанні аб адміністратыўна-судовай арганізацыі гарадской улады, вылучалі два этапы ў гісторыі гарадскіх паселішчаў – вечавы і магдэбургскі. Змяненні ў кіраванні гарадскімі паселішчамі адмоўна паўплывалі на іх эканамічнае развіццё [2]. У працах гэтых даследчыкаў не разглядаліся пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця гарадоў і мястэчак на тэрыторыі Беларусі.

Апісальны характар насілі працы П. П. Сямёнава і У. П. Сямёнава [3], але ў іх утрымліваецца значны фактычны матэрыял па эканоміцы гарадскіх паселішчаў у беларускіх губернях.

Першымі працамі, у якіх ішла гаворка пра сацыяльна-эканамічнае развіццё гарадоў і мястэчак на тэрыторыі Беларусі, былі працы А. У. Бурдэйка, Д. І. Даўгяла, М. В. Даўнар-Запольскага, В. Д. Дружчыца, Ф. І. Забела, К. І. Кернажыцкага, В. І. Пічэты і інш. У даследаваннях гэтых аўтараў маюцца звесткі аб развіцці эканомікі гарадскіх паселішчаў у беларускіх губернях у XVI–XVIII стст. [4].

Значны уклад у распрацоўку пытанняў гісторыі гарадоў і мястэчак даследуемага перыяду на тэрыторыі Беларусі ўнеслі савецкія вучоныя Л. С. Абэцэдарскі, Ю. І. Драгун, Э. М. Загарульскі, А. П. Ігнаценка, А. М. Карпачоў, З. Ю. Капыскі, П. Ф. Лысенка, В. І. Мялешка, М. А. Ткачоў, Г. В. Штыхаў, С. А. Шчэрбакоў, якія ў сваіх працах дастаткова поўна даследавалі сацыяльную гісторыю беларускіх гарадоў і мястэчак і іх эканамічнае развіццё да канца XVIII ст. [5]. Прыватнаўласніцкія гарады на тэрыторыі Беларусі XVI – XVIII стст. даследаваны ў манаграфіі А. П. Грыцкевіча [6].

У працах па гісторыі асобных гарадоў і мястэчак маюцца раздзелы, прысвечаныя перыяду зараджэння індустрыяльнага грамадства на тэрыторыі Беларусі [7].

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Эканамічнае развіццё Віцебска ў XVIII – першай палове XIX ст. разглядаецца ў працы Ф. І. Адашчыка [8].

Даследаванне гісторыі асобных гарадоў дазволіла В. У. Чапко ў першым томе пяцітомнай «Гісторыі Беларускай ССР» даць характарыстыку сацыяльна-эканамічнага развіцця гарадоў Беларусі ў першай палове XIX ст. У раздзеле «Эканоміка ў першай палове XIX ст.» аўтар разглядае новыя з'явы ў эканамічным і сацыяльным жыцці гарадскіх паселішчаў – рост колькасці насельніцтва і змяненне сацыяльнага складу гараджан, арганізацыю рамеснай вытворчасці, павелічэнне аб'ёму прамысловай вытворчасці, знешняга і ўнутранага гандлю.

Гэтыя пытанні разглядаюцца і ў манаграфіі В. У. Чапко [9], дзе асобая ўвага была звернута да аналізу перыяду 30–50-я гг. XIX ст. Аўтар разгледзіла таксама прычыны росту колькасці рамеснікаў і іх размеркаванне па спецыяльнасцям, таварнасць рамеснай вытворчасці і яе ўплыў на цэхавую арганізацыю, працэс перарастання рамяства ў вытворчасць таварнага характару, змяненне колькасці і складу купецтва, напрамкаў унутранага і знешняга гандлю, сельскагаспадарчыя заняткі гараджан і промыслы.

А. Ф. Вішнеўскі даследаваў асобныя бакі сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускіх гарадоў і мястэчак у канцы XVIII – першай трэці XIX ст. [10].

Да прац па іншым пытанням сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі ў даследуемы перыяд, у якіх маецца фактычны матэрыял па праблеме зараджэння індустрыяльнага грамадства адносяцца манаграфіі М. Ф. Болбаса, М. Ц. Раманоўскага, П. Р. Рындзюнскага і інш. [11].

У 1987 г. была выдадзена кніга А. М. Лютага «Сацыяльна-эканамічнае развіццё гарадоў Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX стагоддзя», у якой аўтар даследуе сацыяльны і нацыянальны склад гарадскога насельніцтва, аналізуе эканамічнае развіццё гарадоў і мястэчак, заняткі гараджан. У манаграфіі разглядаюцца заканамернасці станаўлення індустрыяльнага грамадства, асаблівасці гэтага працэсу ў гарадах і мястэчках на тэрыторыі Беларусі [12].

У 1998 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю І. В. Соркіна «Роля мястэчак у сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX стагоддзяў» [13], у якой аўтар прааналізавала працэс зараджэння індустрыяльнага грамадства ў шматлікіх і рознатыповых мястэчках у беларускіх губернях.

Такім чынам, найбольш яскрава новыя з'явы ў сацыяльна-эканамічным жыцці грамадства на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. праявіліся ў гарадах і мястэчках. Першы этап фарміравання індустрыяльнага грамадства прыпадае на перыяд зараджэння буржуазных адносін. Таму даследаванне працэсу капіталізацыі мае не толькі тэарэтычнае, але і вялікае практычнае значэнне. Эканамічная структура індустрыяльнага грамадства вырастала з эканамічнай структуры патрыярхальнага быту і складу жыцця і «разлажэнне» апошняга вызваліла элементы першага [14]. Працэс разлажэння старога і фарміраванне новага спосабу вытвор-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

часці ўплывалі на ўсе бакі эканамічнага і сацыяльнага жыцця гарадоў і мястэчак на тэрыторыі Беларусі. Пачынаўся ўпадак прамысловых прадпрыемстваў, якія базіраваліся на прымусовай працы, і ў той жа час у асобных галінах вытворчасці (галоўным чынам суконнай) назіраўся рост вольнанаёмнай працы, наглядалася развіццё ўнутранага і знешняга гандлю.

Неабходнасць даследавання гісторыі гарадоў і мястэчак на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. абумоўлена і такім палітычным актам, як далучэнне беларускіх земляў да Расійскай імперыі. Моцная цэнтралізаваная ўлада царызму пазбавіла ад самавольства буйных польскіх магнатаў, прывяла да ліквідацыі феадальных міжусобіц на тэрыторыі Беларусі, а яе землі былі ўключаны ў агульнарасійскую адміністрацыйную і гаспадарчую сістэму, умацаваліся і эканамічныя сувязі з іншымі рэгіёнамі Расіі. Былі створаны ўмовы для больш хуткага развіцця рамяства, дробнатаварнай вытворчасці, росту таварнасці сельскай гаспадаркі, развіцця транспарту, павелічэнню гарадоў, мястэчак і гарадскога насельніцтва, росту тэмпаў першапачатковага назапашвання капіталу, неабходнага для развіцця гандлю і прамысловасці.

***Літаратура***

1. Антонович, В. Б. Архив Юго-Западной России. Киев, 1859– 1911. Ч. 1–8; Грушевский А. С. Повинность городовой работы в Великом княжестве Литовском. Пг., 1914; Он же. Города Великого княжества Литовского в XIV–XVI вв.: Их старина и борьба за старину. – Киев, 1918; Любавский, М. К. Литовско-русский сейм. – М., 1900; Он же. Очерки истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно. – М., 1910; и др.

2. Антонович, В. Б. Исследование о городах Юго-Западного края II: Монография по истории Западной и Юго-Западной России. – Киев, 1885. Т. I; Владимирский-Буданов М. Ф. Немецкое право в Польше и Литве. – СПб., 1868.

3. Семенов, И. П. Полное географическое описание нашего отечества / И. П. Семенов. – СПб., 1905. Т. IX; Семенов, В. П. Живописная Россия. / В. П. Семенов. – СПб., 1882. Т. 3.

4. Довгялло, Д. И. Город Лепель. Витебская губ.//Виленский календарь на 1905 год. Вильна, 1904; Он же. Друя, заштатный город Виленской губернии // Памятная кн. Виленской губернии на 1907 год. Вильна, 1906; Доўнар-Запольскі, М. Сацыяльна-эканамічная структура Літоўска-Беларускае дзяржавы ў XVI–XVIII стагод- дзях // Пст.-археал. зб. 1927. № 1; Пічэта У. Эпоха гарадской гас- падаркі на Беларусі // Полымя. – 1925. – № 6; Он же. История сельского хозяйства и землевладения в Белоруссии. – Минск, 1927; и др.

5. Абецедарскі Л. С. 3 Гісторыі руска-беларускіх сувязей у XVII ст. // Весці АН БССР. 1955. – Мінск, 6. С. 27–36; Загоруль скій Э. М. Древний Минск. – Минск, 1963; Он же. Общая планировка и застройка раннефеодального города на территории БССР по археологическим данным II Тр. Ин-та ист. АН БССР. Вып. 3. Досоветский период, 1958; Карпачоў, А. М. Эканамічнае развіццё Мінска ў XVIII стагоддзі // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1962. № 2; Копысскйй, 3. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVII –



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

первой половине XVIII в. – Минск, 1966; Мялешка, В. І. Да пытання аб зараджэнні капіталістычных адносін у гарадской дробнай прамысловасці Беларусі першай палавіны XVIII ст. (На матэрыялах горада Магілёва) // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1959. № 2; и др.

6. Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. / А. П. Грицкевич. – Минск, 1975.

7. История Минска. Минск, 1957; Полоцк Ист. очерк. Минск, 1962; Гродно: Ист. очерк. Минск, 1964; Могилев. Ист. очерк Минск, 1959; и др.

8. Адащик, Ф. И. Экономическое развитие белорусского города в XVIII – первой половине XIX века (На материалах Витебска) / Ф. И. Адащик. – Минск, 1963.

9. Чепко В. В. Города Белоруссии в первой половине XIX века: Экономии, развитие / В. В. Чепко. – Минск, 1981.

10. Вишневский, А. Ф. Сельскохозяйственные занятия и отхожие промыслы горожан Белоруссии в 30–50-е гг. XIX в. // Сб. науч. тр. аспирантов / Мин. пед. ин-т им. А. М. Горького. Минск, 1972. С. 55– 76; Он же. Внутренняя торговля городов Белоруссии в 30–50-е гг. XIX в.//Вопр. истории. Минск, 1972. С. 6–8; Он же. Ремесленное производство городов Белоруссии в первой половине XIX в. // Материалы науч. конф. аспирантов. Баку, 1973. С. 87–93; Он же. Ярмарочная торговля городов Белоруссии в период кризиса феодализма (30–50-е гг. XIX в.) // Вопр. истории. – Минск, 1974. Вып. 1. С. 27–37; Он же. Мануфактурное производство городов Белоруссии в 30–50-е гг. XIX в. // Вопр. истории, Минск, 1975. Вып. 2. С. 3–14.

11. Рындзюнский П. Г. Городское гражданство дореформенной России / П. Г. Рындзюнский. – М., 1958; Болбас, М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795–1861 гг.) / М. Ф. Болбас. – Минск, 1966; Романовский, Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии (вторая половина XVIII – первая половина XIX века) / Н. Т. Романовский. – Минск, 1966; и др.

12. Маркс, К. Капитал. Т. 1 // Маркс К., Энгельс Ф. Соч. 2-е изд. – Т. 23. – С. 727.

13. Статистическое изображение городов и посадов Российской империи по 1825 год. СПб., 1830; Обозрение состояния городов Российской империи в 1833 году. СПб., 1834; Статистические таблицы о состоянии городов Российской империи. СПб., 1840; Статистические таблицы о состоянии городов Российской империи, Великого княжества Финляндского и Царства Польского. СПб., 1842; Статистические таблицы о состоянии городов Российской империи по сведениям на 1847 год. СПб., 1852; Статистические таблицы Российской империи за 1856 год. СПб., 1858; Статистические таблицы Российской империи. Вып. 2. Наличное население империи за 1858 г. СПб., 1863. Экономическое состояние городских поселений Европейской России в 1861–1862 гг. СПб., 1863. – Т. 1.

14. Матэрыялы да гісторыі мануфактур Беларусі 5Г часы распаду феадалізму. – Мінск, 1934. Т. 1–2. Дакументы і матэрыялы да гісто- рыі Беларусі (1772–1903 гг.). Мінск, 1940. Т. 2. Белоруссия в эпоху феодализма: Сб. документов и материалов. – Минск, 1961. – Т. 3.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ